Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
_____________Р.С. Сідарэнка

«12» сакавіка 2019 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Магілёў, 2019 г.*

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Сёлета споўнілася 100 гадоў з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. На працягу першага дзесяцігоддзя існавання БССР яе ўрадам актыўна праводзілася палітыка беларусізацыі, вынікам якой стала ўвядзенне беларускай мовы ва ўсе найважнейшыя сферы грамадскага жыцця. Аднак менавіта ў гэты перыяд, дваццатыя гады XX стагоддзя, беларуская літаратурная мова ў шэрагу параметраў заўважна адрознівалася ад яе сучаснага нарматыўнага варыянта.

Для прыведзеных ніжэй слоў паспрабуйце аднавіць іх арфаграфічныя і фанетычныя асаблівасці ў адпаведнасці з тагачаснымі нормамі.

**Заўвага**: крытэрыем правільнасці адказаў з'яўляецца адпаведнасць напісанню слоў у наступнай крыніцы: *Некрашэвіч, С. Расійска-беларускі слоўнік / С. Некрашэвіч, М. Байкоў. – Менск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1928. – 721 с.*

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

| | | | |
|---|---|---|---|
| з'езд | | акно | |
| калонія | | смяяцца | |
| манета | | вулкан | |
| французскі | | літр | |

**Заданне 2.** Адной з задач у рэалізацыі палітыкі беларусізацыі ў дваццатыя гады XX стагоддзя была распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі. Адметнасцю гэтага працэсу было імкненне распрацоўшчыкаў ствараць новыя словы на ўласным моўным матэрыяле. Першыя спробы ў гэтай справе аказалі значны ўплыў на развіццё беларускай кніжнай лексікі: шмат якія словы, што з'явіліся ў той час дзякуючы моватворчай дзейнасці вучоных-філолагаў і спецыялістаў у іншых галінах навукі, такія, як, напрыклад, *выкапень*,

*выслоўе*, *дужкі*, *працягласць*, ужываюцца і сёння. Аднак нямала іх толькі ў слоўніках таго часу.

Паспрабуйце “вылічыць” значэнні прыведзеных ніжэй слоў, што ўвайшлі ў тэрміналагічныя зборнікі дваццатых гадоў XX стагоддзя, але не замацаваліся ў мове, і запішыце іх сучасныя адпаведнікі.

**Заўвага**: словы запісаны ў адпаведнасці з сучаснымі правіламі арфаграфіі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| мнагасценнік (мат.) | |
| канцавоссе | |
| крышталёк (анат.) | |
| часапісьменства | |
| слупок (батан.) | |
| будаўнічы | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Долго бегал Русачок по лесу. Всех зверей повидал. Все ему, кроме Волка – он еще злей Лисы, – понравились. Да только не совсем. Хотел было Мышкой стать – да больно мала и уши коротки; хотел Ежом – да больно колючий, никто его не погладит, а заяц – он ласку любит; хотел Бобром – да в реке больно мокро… Совсем было собрался Медведем стать: сказал ему Медведь, что он мед ест, а мед, мол, еще слаще морковки, – да не захотел Русачок зимой в берлоге спать, лапу сосать *(По Б. Заходеру)*.

**Заданне 4.** Запішыце прыведзеныя словы адпаведна іх марфемнай будове ў патрэбныя слупкі табліцы. Пры выкананні задання прыміце пад увагу наступнае: 1) словы аналізуюцца ў прыведзенай граматычнай форме, 2) пры аналізе абавязкова ўлічваюцца нулявыя марфемы.

*Максімальная колькасць балаў – **5*** (**0,25** бала за кожны правільны адказ).

**Словы для аналізу:** адвезлі, беларускі, брусніčнік, вогнішча, гадоўля, дажынкі, занятасць, зацесны, зачапіла, напісаны, недагаварылі, нядоўгі, падаконнік, падзямелле, перамога, правобраз, прачытваюць, прывычка, сасоннік, світанне.

| ¬ ∩ ^ □ | ¬ ∩ ^ ^ □ | ∩ ^ □ | ¬ ∩ □ | ∩ ^ ^ □ |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**Заданне 5.** Адной з арфаграфічных цяжкасцей беларускай мовы з'яўляецца правапіс часціц (і часам прыставак) ***не*** і ***ні***.

1) Сфармулюйце іх асноўнае семантычнае (сэнсавае) адрозненне.
2) Устаўце ў прыведзеных сказах прапушчаныя літары ***е, і, я***.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

## Сэнсавыя адрозненні *не*/*ні*

**1.** Хто Палесся н.. бачыў, у Пінску н.. разу н.. быў, на Прыпяці хто н.. рыбачыў, – той н.. зведаў красу свайго краю.

**2.** Н..дзе н.. чуваць было н.. лёскату машын, н.. грукату матораў, н.. людскіх галасоў.

**3.** "Н.. ў цёмным лесе, н.. ў чарніцах да вуснаў мілай н.. падступіцца", – гэту песню мы чулі н.. раз, але н.. ведалі яе аўтара.

**4.** Н..ма над возерам н.. ластавак, н.. чаек, і вецер н.. травінкі н.. калыша.

**5.** Яны маладыя, н..чым н.. засмучоныя, дык хіба ж ім н.. пагаварыць, н.. пасмяяцца?

**6.** Хай н.. кране зіма марозам н.. вачэй тваіх, н.. губ, хай н.. прыносяць халады н..ўдач.

**7.** Н..колькі н.. шкада н.. сіл, н.. грошай на гэта н..звычайнае падарожжа.

**8.** Што б н.. здарылася, што б н.. было – праўда, н..сумненна, н.. можа н.. перамагчы.

**9.** Як н.. паважаць гэтага чалавека, н.. захапляцца яго н..ўрымслівасцю, н..спакоем, якія н.. прападалі н.. на хвіліну!

**10.** Дзе б я н.. быў, н.. забываў Радзіму, н.. дуба, н.. бярозы н.. мінаў.

**Заданне 6.** Пастаўце ў сказах патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце і запішыце ў дужках колькасць сэнсава-граматычных частак у кожным з іх.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1.** Трывога за свае летуценні адбіваецца першай маршчынкай на твары і неспакой не-не ды і агорне сэрца ці ўдасца табе зрабіць тое на што ты разлічваў аб чым неаднойчы горача марыў. (___)

**2.** У лесе яшчэ адчувалася ранішняя прахалода зрэдку калі я чапляўся за куст пырскала па твары раса але раса і прахалода былі ўжо як падагрэтыя. (___)

**3.** Адчуваючы што юнацтва мінае мы думаем а што за той мяжой дзе пачынаецца сталасць дзе розум бярэ верх над пачуццямі? (___)

**4.** Без гэтай ліпы нават цяжка было ўявіць сабе тутэйшы ландшафт таму раніцай кожны здзіўлена задаваў пытанне любому стрэчнаму што сталася куды падзелася Антосева ліпа? (___)

**Заданне 7.** У малюнках зашыфраваны ўстойлівыя фразеалагічныя выслоўі. Запішыце чатыры з іх, арыентуючыся на прадметна-асацыятыўныя сувязі малюнкаў з адпаведнымі прыказкамі, прымаўкамі і фраземамі.

У дужках запішыце нумары малюнкаў, якія вы выкарысталі для «фразеалагічных» асацыяцый.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*



**1.**



**2.**



**3.**



4.



5.



6.



7.



8.



9.



10



11



12.



13.



14.

**Заданне 8**. Аднавіце азначэнні літаратуразнаўчых тэрмінаў, уставіўшы на месцы пропускаў патрэбныя словы.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

1. Эпас, лірыка і драма – тры асноўныя _______________ мастацкай літаратуры.

2. Пабудова твора, размяшчэнне глаў, раздзелаў – гэта _______________ мастацкага твора.

3. Тое, што адлюстроўваецца ў творы, пра што ідзе размова ў творы, што ў ім паказваецца, называецца _________________.

4. Асноўнае жыццёвае пытанне, якое пісьменнік ставіць у творы, на якое звяртае ўвагу чытача, называецца ____________________.

5. __________________ – гэта мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з’яву або чалавека.

6. *Рана-раненька пчала*
*Пакідала вулей,*
*Заспявала-загула,*
*Каб усе пачулі.*

У гэтым урыўку з верша А. Вольскага выразна адчуваецца паўтор гукаў [а] і [у]. Такі элемент фонікі называецца _______________.

**7.** Іншасказальнае адлюстраванне прадмета ці з'явы праз вобразы, якія маюць пераносны сэнс, называецца ________________________________. Выкарыстоўваецца часцей у байках і прыпавесцях (прытчах).

**8.** Кантраснае супастаўленне процілеглых вобразаў, думак, перажыванняў для ўзмацнення ўражання ад іх ці выяўлення іх супярэчлівасці называецца ________________________________.

**Заданне 9.** Пералічаныя персанажы адносяцца да аднаго літаратурнага твора, але адзін з іх *«лішні»*, ён *«прыйшоў»* з іншага твора.

Запішыце ў табліцы *«лішні»* персанаж і адпаведны твор для яго **(1)**. Запішыце назву твора і для астатніх персанажаў **(2)**.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Персанажы твора** | **«Лішні» персанаж** | **Назвы твораў і іх аўтары** |
|---|---|---|
| *Мульцік, Машэка, Гастрыт, Ганна* | | **1.** |
| | | **2.** |
| *Аўсееў, Аліндарка, Свіст, Фішар* | | **1.** |
| | | **2.** |
| *Сцяпан Крыніцкі, Юрый Гораў, Сымон, генерал Фікельмонт* | | **1.** |
| | | **2.** |
| *Лаўрэнцій Кіпрыянавіч, Эма Пшанічная, Цыпрук, Тэкля* | | **1.** |
| | | **2.** |

**Заданне 10.** Прачытайце тэксты розных стыляў маўлення. У прапанаваных тэкстах утрымліваюцца алюзіі (намёкі) на вядомыя вам творы. Пазнайце іх і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **№ п.п.** | **Назва твора** | **Аўтар** | **Жанр** |
|---|---|---|---|
| **1.** | | | |
| **2.** | | | |
| **3.** | | | |
| **4.** | | | |
| **5.** | | | |

## 1. ПРАТАКОЛ

судовага пасяджэння па разглядзе справы № 2312

ад 23.05.1903 г.; ваколіцы О… Пінскага павета

Судовая калегія па грамадзянскіх пазовах у складзе: станавога прыстава, сакратара ў прысутнасці дзясяцкага разгледзела у адкрытым судовым пасяжэнні грамадзянскую справу паводле пазова П. і сустрэчнага пазова Ц. аб нанясенні

цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Трэція асобы – блізкія сваякі пацярпелых, сведкі і інш. – 10 чал.

Судовая калегія, параіўшыся на месцы, вызначыла: *Следства завершана. Паводле Указа ад 49.04.1893 і пастановы Кацярыны II ад 23.09.1903 і раўназначна Статута ВКЛ, раздз. 8, парагр. 193, пазоўнікам прызначаецца сплаціць на карысць суда: пошліны – 20, за транспартныя выдаткі –16, за канцылярскія выдаткі – 10 руб. Сведкам – па 9 руб., не сведкам, паколькі не сведчылі – па 3 руб.*

Рашэнне вынесена і абвешчана.

**2.** Аўтэнтык агіяграфічнага тэксту XII (XIII) ст. не захаваўся. Налічваецца болей за 100 яго спісаў, якія ўкладаюць 6 рэдакцый, што перадаюць асаблівасці страчанага арыгінала. Помнік створаны ў манументальна-гістарычным стылі, паводле жанру адносіцца да біясаў. Вобраз прадстаўніцы роду Усяслава Брачыславіча ідэалізаваны ў адпаведнасці з агіяграфічным канонам і супастаўляецца з іконай. Дзеянне разгортваецца ў межах трафарэтнай схемы царкоўнага і дыдактычнага твора, што не замінае стварэнню аб'ёмных і жывых вобразаў гераіні, яе сясцёр, паплечніц, бацькі, братоў, царкоўных уладык, адлюстраванню менталітэту і духоўных каштоўнасцей сярэднявечнага грамадства.

**3.** Рубрыка «Гарадскія легенды»

ПОЛАЦКАЯ СЕНСАЦЫЯ

За колькі вёрст ад горада на беразе Палаты стаў з'яўляцца прывід гожай заплаканай жанчыны ў белым. Відавочцы пазнавалі яе і па чорнай хустцы, накінутай на плечы. Блогеры сцвярджаюць: прывід ахоўвае спакой старых пахаванняў. Цікаўныя падлеткі ўчынілі раскопкі магілы рыцара, бо акурат там бачылі праяву. Нашы крыніцы сцвярджаюць: няўдалыя археолагі моцна напалохаліся, бо з пачаткам іх працы пайшоў дождж, засвістаў вецер, засвяціла маланка. Хлопцы ўцяклі. Інтэрв'ю нашага карэспандэнта з аматарамі скарбаў чытайце ў ранішнім нумары. Яны раскажуць пра волата, якога паспелі заўважыць.

**4.** Слухай, што кажу. На маім участку дрэвы размаўляюць. Далібог! Адно старое таўшчэзнае дрэва чыстай вады папрасіла. Пабег шукаць той вады, ясная справа. Ці ж я не чалавек? Усё жывое шкада. Бабулькі па суседстве падказалі, куды што. Кінуўся да аднаго возера, ажно няма як тую ваду ўзяць – салёная. Кінуўся да другога – горкая. Што за зданькі, думаю… А ў трэцім возеры ўвогуле чырвань адна. Спалохаўся я, дружа, – не перадаць! І ад таго прахапіўся. Прыснуў крыху я пад сваім дрэвам, во што. А ў сне чаго толькі не прымроіцца.

**5.** "...галубка... чарнабровая мая... мая галубка...
галубка... чарнабровая мая... мая галубка..."
О Божухна неміласэрны!.. Костусь!..
Не па свайму мяне абраў ты росту.
Не па свайму. Ты дужы. Я слабая.
Ты смерць прыняў за ўвесь гаротны люд.
А я адно табой была жывая.